ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ВІЦЕБСКІ РАБОЧЫ

ОРГАН ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА КАМІТЭТАЎ КП(б)Б, АБЛАСНОГА І ГАРАДСКОГА СОВЕТАЎ ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№33--34(7110-11) | Панядзелак, 24 красавіка 1944 г. | Цана 20 кап.

„Апіраючыся на магутнасць совецкай дзяржавы, на яе велізарную дапамогу калгаснаму сялянству, на плённую калектыўную працу калгаснікаў, на ўзаемную брацкую дапамогу калгаснікаў і калгасаў другіх абласцей і рэспублік, на нястомную напружаную творчую працу нашых совецкіх і партыйных арганізацый,—мы можам і павінны аднавіць сельскую гаспадарку вызваленых раёнаў і абласцей Беларусі за самы кароткі тэрмін".

П. К. ПАНАМАРЭНКА.

## Вызваленне беларускіх земляў, далейшыя задачы барацьбы беларускага народа супроць нямецкіх захватчыкаў і бліжэйшыя задачы аднаўлення народнай гаспадаркі Беларускай ССР

*Даклад Старшыні Совета Народных Камісараў Беларускай ССР тав. П. К. ПАНАМАРЭНКА на VI сесіі Вярхоўнага Совета БССР*

**21 сакавіка 1944 г. у гор. Гомелі*)**

ТАВАРЫШЫ ДЭПУТАТЫ!

VI-я сесія Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі сабралася ў момант гістарычных перамог совецкіх войск над нямецка-фашысцкімі захватчыкамі.

Доблесная Рабоча - Сялянская Чырвоная Армія ў найвялікшых за ўсю гісторыю войнаў бітвах нанесла небывалыя паражэнні гітлераўскім войскам і ўжо каля паўтара годы вядзе пабеданоснае наступленне.

Чырвоная Армія прайшла з баямі на захад месцамі да 2 тысяч кілометраў. Амаль поўнасцю вызвалена ад нямецкіх захватчыкаў Совецкая Украіна. Пачалося вызваленне Совецкай Малдавіі і Прыбалтыйскіх совецкіх рэспублік.

Ідзе масавае выгнанне гітлераўцаў за межы Беларусі. Наступаюць радасныя дні вызвалення ўсёй Совецкай Беларусі і вызвалення нашага народа з-пад гнёту нямецкіх катаў і разбойнікаў. Ужо амаль поўнасцю вызвалены ад нямецкіх захватчыкаў Палеская і Гомельская абласці, вызвалена многа раёнаў Магілёўскай і Віцебскай абласцей.

Блізка дзень, калі ўся наша совецкая зямля будзе поўнасцю ачышчана ад гітлераўскай погані.

Совецкае насельніцтва вызваленых ад нямецкіх захватчыкаў абласцей з невыказнай радасцю сустракае сваю вызваліцельніцу Чырвоную Армію. Іх сэрцы поўны глыбокай удзячнасці і любві да таварыша Сталіна—арганізатара і кіраўніка перамог над нямецкімі прыгняtальнікамі. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ. УСЕ ЎСТАЮЦЬ).

У тытанічнай пабеданоснай барацьбе народаў Совецкага Саюза супроць нямецка-фашысцкай Германіі і яе прыхвасняў беларускі народ заняў пачэснае, дастойнае месца. Беларускі народ, ахоплены непрымірымай смяртэльнай нянавісцю да крывавых ізвергаў—нямецкіх захватчыкаў, па першаму закліку большэвіцкай партыі, нашага правадыра таварыша Сталіна, разам з усім совецкім народам узняўся на абарону Совецкага Саюза, свабоды, чэсці, жыцця ўсіх народаў нашай Радзімы.

Сотні тысяч сыноў беларускага народа на ўсіх фронтах Вялікай Айчыннай вайны пляча ў пляча з рускім і другімі народамі совецкай краіны адстайваюць сваю любімую Радзіму.

У гістарычных бітвах пад Масквою, Сталінградам, Белгарадам, Орлом, Курскам, Гомелем, пад Ленінградам, Кіевам, на Украіне, у Беларусі—усюды гераічныя сыны беларускага народа з бяспрыкладнай мужнасцю змагаліся і змагаюцца з заклятымі ворагамі—нямецкімі захватчыкамі.

На часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў тыле гітлераўскіх полчышч з небывалым размахам і сілай разгарнуўся ўсенародны партызанскі рух. Беларускія партызаны і партызанкі абрушваюць на ворага цяжкія ўдары і громяць тылы яго войск.

Вялікая любоў і пашана беларускага народа да свайго вялікага сабрата—рускага народа. Вялікая адданасць і згуртаванасць беларускага народа вакол большэвіцкай партыі і найвялікшага правадыра і друга беларускага народа таварыша Сталіна. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Пад сцягам Леніна, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна мы канчаткова разгромім нямецкіх ізвергаў і выганім іх за межы нашай Радзімы. (БУРНЫЯ, ПРАЦЯГЛЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

### І. Росквіт БССР за годы совецкай улады і з'яднанне беларускага народа ў адзінай дзяржаве

У выніку Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, воляю нашай партыі, па ініцыятыве і ў выніку велізарнейшай палітычнай і арганізатарскай дзейнасці таварыша Сталіна была ўтворана Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

Упершыню за ўсю шматгадовую гісторыю нацыянальнага і эканамічнага прыгнёту, пакут і гора беларускі народ набыў сваю дзяржаву.

Пры совецкай уладзе Беларусь уступіла на шлях небывалага ў гісторыі росквіту краіны, развіцця яе вытворчых сіл, росту прамысловасці і сельскай гаспадаркі, росквіту матэрыяльнага добрабыту і нацыянальнай культуры.

Беларускі народ, аб выключнай беднасці якога да рэвалюцыі хадзілі легенды, народ, які ішоў тысячамі з Беларусі ў пошуках лепшай долі,—стаў на шлях росквіту, добрабыту, будаўніцтва шчаслівага забяспечанага жыцця.

Беларусь, якая мела да рэвалюцыі толькі дробную саматужную прамысловасць, у выніку ажыццяўлення генеральнай лініі партыі, стала на шлях бурнага развіцця прамысловасці.

За годы сталінскіх пяцігодак у Беларусі пабудавана звыш 1700 новых прадпрыемстваў. Былі створаны новыя галіны прамысловасці. У рэспубліцы пачалі выраблящца матары і турбіны, сельскагаспадарчыя машыны і станкі, веласіпеды, радыёпрыёмнікі, складаныя машыны і самыя разнастайныя прамысловыя вырабы. Узніклі буйнейшыя прадпрыемствы лёгкай прамысловасці—швейная, абутковая, тэкстыльная. Былі пабудаваны буйнейшыя электрычныя станцыі.

Асабліва бурна пачала развівацца прамысловасць пасля з'яднання Беларусі ў адзінай дзяржаве. Усё значэнне грандыёзнага размаху будаўніцтва прамысловасці і сельскай гаспадаркі відаць з таго, што на 1941 год капіталаўкладанні ў прамысловасць і сельскую гаспадарку Беларусі былі роўны капіталаўкладанням двух папярэдніх пяцігодак. У Беларусі будаваліся і былі напярэдадні пуску буйнейшыя заводы машынабудаўнічай прамысловасці. Быў пабудаваны Днепра-Бугскі водны шлях—велізарная народная будоўля, выкананая за рэкордна кароткі тэрмін, дзякуючы невычарпальнай творчай актыўнасці народа. Будаваліся заводы па хімічнай перапрацоўцы торфу, торфабрыкетныя заводы, будаваўся першы завод па вытворчасці бензіну з торфу. Рыхтаваўся да будаўніцтва завод па атрыманню эцілавага спірту з торфу.

Вялася велізарная работа па рэканструкцыі сталіцы Беларусі—Мінска і гарадоў—Магілёва, Гомеля, Беластока, Віцебска і другіх. Узніклі сотні велізарных шматкватэрных будынкаў, клубаў, вакзалаў. Было прыступлена да будаўніцтва Васілевіцкай, Беластоцкай, Баранавіцкай і Магілёўскай электрастанцый, увод якіх у строй азначаў падваенне энергетычнага баланса рэспублікі.

Беларусь з краіны выключна сельскай гаспадаркі ператварылася ў перадавую, індустрыяльную рэспубліку.

На аснове індустрыялізацыі краіны была праведзена перабудова сельскай гаспадаркі. Сялянства Беларусі, згуртаванае вакол партыі большэвікоў, рашуча стала на шлях калектыўнага вядзення гаспадаркі, на шлях стварэння новых грамадскіх адносін у вёсцы.

Калгасы прынеслі Беларусі небывалы росквіт сельскай гаспадаркі, матэрыяльны і маральны рост вёскі. Калгасы вывелі са становішча вечнай нястачы мільённыя масы беларускага сялянства. Каля 10 тысяч калгасаў, якія аб'ядналі 720 тысяч сялянскіх двароў, атрымалі ад совецкай дзяржавы да 8 мільёнаў гектараў зямлі ў вечнае карыстанне.

Беларуская калгасная вёска атрымала многія тысячы трактараў і сельскагаспадарчых машын. У рэспубліцы было створана 347 машына-трактарных станцый, якія далі палёгку ў працы селяніна, забяспечылі культурную апрацоўку зямлі і ўзнялі добрабыт калгаснікаў.

У калгасах няспынна расла пасеўная плошча, з года ў год расла ўраджайнасць палёў. У некалькі разоў павялічылася колькасць буйнай рагатай жывёлы і свіней супроць дарэвалюцыйнай. Не было ў рэспубліцы калгаснага сялянскага двара, які-б не меў каровы, свіней, птушкі.

У галіне сельскай гаспадаркі былі праведзены такія мерапрыемствы, як паўсямеснае ўвядзенне правільных севаабаротаў, ссяленне хутароў.

У 1940 годзе, па ініцыятыве таварыша Сталіна, была прынята праграма грандыёзных работ па асушэнню спрадвечных балот Беларусі. Беларускія балоты, якія з'ўляліся ў мінулым крыніцай жабрацтва, хвароб і бездарожжа, павінны былі ператварыцца ў квітнеючыя палі і сенажаці—крыніцу багацця калгасаў і калгаснікаў.

За адзін год работы па выкананню гэтай праграмы было асушана больш 100 тысяч гектараў балот. З велізарным энтузіязмам увесь беларускі народ удзельнічаў у гэтай рабоце. Калгасы, якія асушылі ўчасткі балотнай зямлі за два—тры годы раней, ужо атрымлівалі велізарныя ўраджаі. Першыя калгасы-мільянеры ў Беларусі з'явіліся пасля таго, як яны асушылі вялікія масівы балотных земляў, на якіх сталі атрымліваць выдатныя не толькі для Беларусі, але і для ўсяго Совецкага Саюза ўраджаі.

Выкананне праграмы па асушцы балот і ператварэнне іх у высока-

(Працяг гл. на 2 стар.)

*) Скарочаная стэнаграма.

# Працяг даклада П. К. Панамарэнка

ўраджайныя палі зусім змяняла эканамічнае аблічча рэспублікі.

Разам з бурным росквітам народнай гаспадаркі рэспублікі, уздымам матэрыяльнага добрабыту беларускага народа, гіганцкі выраслі культура, навука, літаратура і мастацтва.

Будучы адсталай ускраінай царскай Расіі, Беларусь не мела права на сваю мову, на сваю культуру. Гэта была краіна амаль пагалоўнай непісьменнасці, яна не мела не толькі ні адной вышэйшай навучальнай установы, ні аднаго інстытута, але і ні адной школы на беларускай мове.

За годы савецкай улады з народа выраслі свае вучоныя, пісьменнікі, педагогі, артысты, мастакі, кампазітары. Вырас велізарны атрад новай інтэлігенцыі, узнятай з народных нізоў.

За годы рэвалюцыі расквітнелі ўсе віды мастацтва таленавітага народа. У Савецкай Беларусі было 26 вышэйшых навучальных устаноў, Беларуская Акадэмія Навук, навукова-даследчыя інстытуты, дзесяткі тысяч сярэдніх і пачатковых школ, музеі, дзесяткі тэатраў.

З беларускага народа выкаваліся нацыянальныя кадры, дзяржаўныя дзеячы, савецкія і партыйныя работнікі, выдатныя дзеячы навукі і культуры, вялікія арганізатары народнай гаспадаркі. Яны самаадданна працуюць на шчасце народа ва ўсіх звеннях дзяржаўных, партыйных, гаспадарчых органаў і культурных устаноў рэспублікі і многія з іх у органах і ўстановах Саюза ССР, у арміі і флоце.

* * *

У верасні 1939 года адбылася гістарычная падзея ў жыцці беларускага народа—з'еднанне беларускіх зямляў і народа ў адзінай дзяржаве.

Дваццаць год, як вядома, пакутвалі народы Заходняй Беларусі пад гнётам польскіх захватчыкаў. Нідзе ў свеце не было такога рабскага рэжыму, такой бязлітаснай эксплаатацыі, прыгнёту чалавека, як гэта было ў Заходняй Беларусі пад уладай польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Заходняя Беларусь разглядалася імі як калонія і ператваралася ў аграрны дадатак цэнтральнай Польшчы. Эканамічнае абрабаванне рабочых і працоўных сялян, забарона роднай мовы, разгром культурных устаноў беларусаў, зверскія карныя экспедыцыі ў адказ на малейшае праяўленне сімпатыі да рускіх і Савецкага Саюза, канцэнтрацыйныя лагеры і турмы з'яўляліся сродкамі так званага ўціхамірання „ўсходніх ускраін". Правядзенне палітыкі дэнацыяналізацыі беларусаў было афіцыйнай лініяй улад, школ, царквы і суда.

Народы Заходняй Беларусі ў гістарычныя дні 1939 года былі выратаваны ад пагражаўшага ім разбурэння, вынішчэння і дэнацыяналізацыі, атрымалі поўнае нацыянальнае вызваленне, назаўсёды пазбавіліся ад дзікага сваволля з боку польскіх магнатаў.

28—30 кастрычніка 1939 года ў Беластоку Народнае Сабранне, абранае свабодным, тайным галасаваннем народамі Заходняй Беларусі, выказваючы волю ўсяго народа, абвясціла ўстанаўленне савецкай улады на ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі і з'еднанне з Савецкай Беларуссю.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка заняла свае законныя гістарычныя і этнаграфічныя граніцы і пераўтварылася ў рэспубліку з 10,5-мільённым насельніцтвам. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

* * *

ТАВАРЫШЫ ДЭПУТАТЫ!

У выніку паспяховага наступлення Чырвонай Арміі, гітлераўскія войскі ўсё далей адкідваюцца на захад; набліжаецца час вызвалення заходніх абласцей Беларусі. У сувязі з гэтым трэба спыніцца на той вазні, якую ўзнялі некаторыя польскія эмігранцкія колы вакол пытання аб заходняй граніцы паміж Польшчай і Беларуссю.

Для польскага народа, для прагрэсіўных польскіх грамадскіх і палітычных дзеячоў з'яўляецца зусім яскравым, што граніцы, устаноўленыя ў 1939 годзе, справядлівыя як у гістарычных, так і ў этнаграфічных адносінах, адпавядаюць інтарэсам як Польшчы, так і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і інтарэсам дружаскіх добрасуседскіх адносін польскай і беларускай дзяржаў.

Аднак некаторыя эмігранцкія рэакцыйныя польскія колы, не лічачыся з інтарэсамі ўласнай дзяржавы, у імя сваіх імперыялістычных інтарэсаў, прабуюць замуціць вакол гэтага пытання ваду і ўлезці сваімі лапамі ў заходнія абласці Беларусі.

Цяжка, вядома, радзівілам, тышкевічам, сапегам і іншым польскім зямельным магнатам расстацца з сотнямі тысяч гектараў зямлі і лясоў, якімі яны карысталіся ў заходніх абласцях, адабраўшы іх у беларускага народа. Цяжка, вядома, ім адмовіцца ад быдла, у якое яны хацелі ператварыць беларускі народ заходніх абласцей Беларусі. Што-ж рабіць? Цяжка, але ўсё-ж прыдзецца адмовіцца, бо народ, які пазнаў шчасце свабоднага жыцця і развіцця ў роднай савецкай з'еднанай дзяржаве, у хамут зноў не палезе. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Палітыканы, якія збанкроціліся і адарваліся ад краіны і народа, ніяк не хочуць зразумець, што прайшоў той час, калі можна было праглынуць чужы, але ласы кавалак шляхам шантажу і інтрыг, не хочуць зразумець, што цяпер на гістарычнай арэне ёсць такія прагрэсіўныя сілы, якія не дадуць гэта зрабіць.

Гісторыю не павярнуць назад, колькі-б ні намагалася гэта эмігранцкая машкара. З'еднаная беларуская дзяржава не аддасць нікому і ніколі ні аднаго метра зямлі, якая належыць беларускаму народу. У гэтым на баку беларускага народа права і сіла дастатковая, каб абараніць краіну ад усякіх пасяганняў. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

## II. Крывавыя зверствы нямецка-фашысцкіх захватчыкаў на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі

Страціўшыя чалавечае аблічча, паўшыя да ўзроўню дзікіх звяроў, забойцы жанчын і дзяцей, рабаўнікі і гвалтаўнікі, нікчэмныя і агідныя гітлераўскія псы крывавымі лапамі ўпіліся ў цела і душу беларускага народа. Няма такога бруднага злачынства, перад якім спыніліся-б гэтыя мярзотнікі. Гнусныя злачынствы фашысцкіх людаедаў перавысілі па свайму цынізму і крывяжэрнасці ўсё, што ведала да гэтага часу гісторыя.

Захватчыкі ў нечуваных маштабах знішчаюць гарады і вёскі Беларусі. Мінск—сталіца рэспублікі, яе палітычны, адміністрацыйны і культурны цэнтр, горад працы і навукі, горад, дарагі і блізкі сэрцу кожнага беларуса,—па-варварску разбуран нямецкімі захватчыкамі. Гомель—адзін з лепшых і прыгажэйшых гарадоў Беларусі—разбуран нямецкімі захватчыкамі дашчэнту. Спалены і разбураны гарады Ліда, Валкавыск, Віцебск, Жлобін, Рагачоў, Чачэрск, Шклоў, Крычаў, Быхаў і Чэрыкаў. У Лельчыцкім раёне з 6.000 дамоў засталося толькі 32 поўразбураныя дамы, у Чэрыкаўскім—разбурана 2.469 дамоў, у Чачэрскім раёне спалена і разбурана 5.026 дамоў. Няма ні аднаго горада і ні аднаго населенага пункта ў Беларусі, які не паспытаў-бы на сабе нямецкай палітыкі знішчэння і разбурэння.

Толькі ў 40 вызваленых раёнах Беларусі яны знішчылі больш 100.000 дамоў і іншых збудаванняў. Яны дашчэнту разбурылі ўсе заводы і фабрыкі. Захватчыкамі знішчана 1.250 школ, тэатры, усе бальніцы.

Яны разбурылі калгасы і абрабавалі калгаснікаў. У вызваленых раёнах засталося не больш 25 процантаў жывёлы. Уся астатняя жывёла вывезена і з'жэрта захватчыкамі.

Нямецкія вандалы знішчаюць культурныя каштоўнасці народа. Яны разграмілі і раскралі Беларускую Акадэмію Навук з яе калекцыямі гістарычных дакументаў і кніг, спалілі каштоўнейшае кнігасховішча—рэспубліканскую бібліятэку імені Леніна, разбурылі і аддалі агню вядомую ўсяму свету Беларускую Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію. Імі разбуран Гомельскі палац Паскевіча—архітэктурны помнік і музей, адно з прыгажэйшых збудаванняў рэспублікі, раскрадзены і знішчаны каштоўнейшыя экспанаты Дзяржаўнай карціннай галярэі Беларускай ССР, разбураны ці пераўтвораны ў канюшні тысячы школ, клубаў. Знішчаны тэатры, музычныя ўстановы і каштоўнейшыя ўзоры народнай творчасці. Ва ўсіх гарадах і населеных пунктах спалены ўсе грамадскія і асабістыя бібліятэкі. Агню адданы ўсе творы найвялікшых класікаў рускай, беларускай і заходняй літаратуры.

Нямецка-фашысцкія звяры па прамых указаннях злачыннага гітлераўскага ўрада праводзяць масавае вынішчэнне мірнага насельніцтва Беларусі.

У г. Мінску нямецкія нягоднікі знішчылі звыш 120 тысяч мірнага насельніцтва, у г. Гомелі—55 тысяч чалавек, у Бабруйску—30 тысяч, у Слоніме—12 тысяч, у Пінску—11 тысяч, у Брэсце—звыш 9 тысяч чалавек.

Масавае знішчэнне насельніцтва праведзена ў Магілёве, Віцебску, Барысаве, Оршы, Бабруйску, Баранавічах, Беластоку і многіх другіх гарадах і сёлах Беларусі.

Страшэнныя забойствы насельніцтва нямецкія захватчыкі ажыццяўляюць з дакладнасцю і хладнакроўем прафесіянальных забойцаў, метадычна і арганізавана.

Вось, напрыклад, гісторыя спалення і пагібелі квітнеючай беларускай вёскі Клетча, Бягомльскага раёна.

З Бягомльскай раённай управы ў вёску Клетча паступіла наступнае распараджэнне:

> «Старасту вёскі Клетча—пану Аўтушка. Прыкладаецца пры гэтым план здачы дзярж-паставак для вёскі Клетча. Прапаную вам выканаць усе зерна-пастаўкі не пазней 27 кастрычніка. Папярэджваю, што ў выпадку невыканання гэтага распараджэння, 28 кастрычніка вёска Клетча будзе спалена нямецкімі войскамі».

З прычыны таго, што вёска Клетча раней ужо была абрабавана і не магла выканаць і сотай часткі плана здачы паставак, нямецкі карны атрад прыбыў 28 кастрычніка і расстраляў усіх мужчын, у тым ліку і старых, а вёску спаліў.

Вось адзін з многіх жахлівых дакументаў аб зверствах немцаў, складзены грамадзянамі на акупіраванай тэрыторыі і дасланы беларускаму ўраду:

> «АКТ
>
> Ноччу 5 сакавіка 1943 г. гітлераўскія звяры ўварваліся ў вёску Вялікае Сітна, Полацкага раёна, і пачалі сонных людзей голых і босых выганяць з хат на мароз. Сагнаўшы, такім чынам, каля 200 чал. і акружыўшы шчыльным кальцом узброеных салдат, немцы пагналі натоўп на возера Карупень. Па дарозе фашысты білі свае ахвяры прыкладамі вінтовак і аўтаматаў, прыканчвалі на месцы тых, якія адставалі. Так, гітлераўцы ўдарам прыклада па галаве забілі адстаўшага ў дарозе 5-гадовага хлопчыка. Калгасніцу Ефрасінню Дзегцярову, якая кінулася яго абараняць, закалолі штыкамі. На дапамогу Дзегцяровай кінуліся Ніна Маяк і браты Шэндзелевы. Фашысты таксама закалолі іх штыкамі, а ўсіх астатніх жыхароў вёскі Вялікае Сітна расстралялі з кулямётаў. Больш 200 трупаў калгаснікаў засталіся ляжаць на ільду возера Карупень, забітыя гітлераўскімі нягоднікамі.
>
> Мы, застаўшыеся ў жывых калгаснікі вёскі, клянёмся над трупамі сваіх дарагіх братоў і сёстраў, бязлітасна і нястомна помсціць гітлераўскім сабакам, у чым і распісваемся».

Следуюць 53 подпісы застаўшыхся ў жывых жыхароў вёскі Вялікае Сітна, Полацкага раёна.

Наперакор агульнапрынятым міжнародным законам і пастановам міжнароднай Гаагскай канферэнцыі аб адносінах да ваеннапалонных, наперакор усім паняццям аб чалавечай маралі, фашысцкія ізвергі чыняць масавыя забойствы ваеннапалонных чырвонаармейцаў і камандзіраў у канцэнтрацыйных лагерах, размешчаных у Беларусі.

На ўсёй тэрыторыі Беларусі захватчыкамі праведзена крывавая масавая расправа над яўрэйскім насельніцтвам. У спецыяльных канцэнтрацыйных лагерах яўрэі знішчаліся шляхам расстрэлаў ці галоднай смерці. У вялікіх гарадах гэта знішчэнне рабілася пасля папярэдняга згону яўрэяў у так званае гета.

Адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі, прадбачачы свой непазбежны разгром, баючыся адказнасці за ўсе свае злачынствы, нямецка-фашысцкія разбойнікі ў цяперашні час імкнуцца замесці сляды сваіх злачынных зверстваў. Паўсямесна на акупіраванай тэрыторыі Беларусі яны раскапваюць масавыя магілы сваіх ахвяр, дастаюць і спальваюць трупы. Робіцца гэта па загаду галоўнай стаўкі германскага вярхоўнага камандавання.

У нашым распараджэнні ёсць тэкст зусім сакрэтнага загада ад 10 лістапада 1943 г., падпісанага начальнікам Бабруйскага гарнізона, генерал-маёрам Гоман, выданага на аснове ўказанняў галоўнай стаўкі германскага вярхоўнага камандавання, аб захаванні ўсіх слядоў расстрэлаў на акупіраванай тэрыторыі. Загад гаворыць:

> «Галоўнакамандуючы нямецкай арміяй загадаў у кароткі тэрмін, да наступлення маразоў, на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Украіны і Беларусі знішчыць сляды зроб-

(Працяг гл. на 3 стар.)

# Працяг даклада П. К. Панамарэнка

леных нямецкімі ўладамі расстрэлаў савецкіх грамадзян. Пагэтаму загадваю з заўтрашняга дня прыступіць да работы па спальванню трупаў, устанаўліваю чарговасць: 1) трупы палітзняволеных, 2) яўрэяў, 3) ваеннапалонных, 4) трупы насельніцтва.

Начальніку сакрэтнай паліцыі вылучыць людзей для выканання работы. Гэтыя людзі павінны быць таксама расстраляны пасля выканання імі работ. Адказнасць за выкананне загада ўскладаю на начальніка гестапо г. Бабруйска».

У выкананне гэтага загада ў раёне Бабруйска за 3 дні было выцягнута з трох ям 19 тысяч трупаў, якія абліваліся гаручай вадкасцю і спальваліся. Ваеннапалонныя і асобы з грамадзянскага насельніцтва, якія выконвалі гэту работу, расстрэльваліся і таксама спальваліся.

10 лістапада ў раёне Еловікі былі выкапаны ўсе трупы расстраляных з 50 магіл, затым гэтыя трупы былі ўкладзены ў штабелі, абкладзены дровамі, абліты вадкасцю і спалены. Работу выконвалі арыштаваныя мужчыны, якія пасля былі таксама расстраляны і спалены.

З 12 лістапада спальванне трупаў пачалося ў раёне вёскі Каменка, дзе восенню 1941 г. расстраляна 9.000 яўрэяў, укладзеных у 3 ямах даўжынёю 50 м., глыбінёю 2 м. і шырынёю 4 м.

Следам за гэтым былі выкапаны ямы на Бярэзінскім форштадце, у г. Бабруйску, дзе былі закапаны расстраляныя і задушаныя галоднай смерцю ў лагерах 25 тысяч савецкіх ваеннапалонных.

Згодна дакладна ўстаноўленых даных, у кастрычніку—лістападзе ў г. Оршы немцы таксама адкапалі ўсіх масава пахаваных расстраляных імі мірных жыхароў. Трупы былі перавезены на льнокамбінат і спалены. Такія-ж раскопкі зроблены вакол г. Мінска ў раёне Трасцянец, вёска Краснае Урочышча, ля ваенгарадка, у раёне г. Магілёва, Барысава і ў другіх гарадах і вёсках Беларусі.

Урад Беларусі мае шматлікія паказанні сведак—савецкіх грамадзян, якія ўдзельнічалі ў адкапванні трупаў і іх спальванні і потым уцяклі, і з ліку грамадзян, якія наглядалі спальванне ўпотай з боку.

Так, напрыклад, грамадзянін вёскі Дрысна, Пашкоўскага сельсовета, Магілёўскай вобласці, Пілуноў Іван Сцяпанавіч расказаў наступнае:

«Будучы 17 жніўня 1943 года арыштаваным, я да 1 кастрычніка 1943 года знаходзіўся ў Магілёўскай турме. З гэтага ліку пачалася разгрузка турмы, якая рабілася галоўным чынам за лік масавых расстрэлаў зняволеных, я быў вылучаны ў рабочую каманду, сфарміраваную на працягу ночы з 280 найбольш моцных па знешняму выгляду зняволеных. Пад моцным канвоем паліцэйскіх і немцаў, узброеных у большасці аўтаматамі і меўшых службовых сабак, каманда была адпраўлена на аўтамашынах у так званы Пашкаўскі лес, які знаходзіцца пад самым Магілёвам. Там з 1 па 28 кастрычніка 1943 года каманда была занята раскопкай трупаў расстраляных і па-зверску закатаваных і іх спальваннем.

З былога супроцьтанкавага рова каля ваеннага гарадка Пашкава, прыблізна ў 200 м. ад шасе, было адкапана, а потым спалена ў трох земляных печах-ірвах да 14 тысяч трупаў. У другіх месцах лесу спалена да 6 тысяч трупаў.

Перад спальваннем падлога земляной печы-ірва ўсцілалася радам прасмоленых бярвенняў, на якія ўкладваўся рад трупаў, яны пакрываліся дровамі і абліваліся смалой. Гэты ярус, даўжынёю 8—10 м. і вышынёю 3—4 м., гарэў па 2—3 сутак, пасля чаго не знішчаныя агнём косці пераціраліся ўручную жалезнымі трамбоўкамі і засыпаліся зямлёю.

Уся работа праводзілася пад вялікім сакрэтам. Асобы, якія выпадкова бачылі гэта відовішча, галоўным чынам сяляне, якія тут праязджалі, расстрэльваліся і спальваліся тут-жа разам з коньмі.

Па сканчэнні спальвання трупаў каманда была разбіта на дзве роўныя па колькасці групы, з якіх адна была вывезена некуды на аўтамашынах пад выглядам працягваць работу ў другім месцы. Тым, хто застаўся, немцы загадалі залезці на штабелі дроў, легчы ў рад, звесіўшы галовы. Даўшы па людзях двайную чаргу з аўтаматаў, немцы падпалілі штабель у некалькіх месцах. Услед за гэтым былі расстраляны папярэдне пакладзеныя ў рад на зямлю паліцэйскія, якія рабілі ўборку навакол штабеляў, а целы іх былі кінуты ў штабель другой групай паліцэйскіх. У ліку расстраляных быў былы начальнік карнага паліцэйскага атрада мястэчка Княжыцы, Магілёўскага раёна, Дзегцяроў.

Я аказаўся параненым і не страціў прытомнасці. Калі немцы паехалі, я выбраўся з ахопленага полымем штабеля і ўцёк".

Гэтыя паказанні Пілунова пацвярджаюцца і іншымі крыніцамі і сведкамі.

Так прабуюць замесці сляды сваіх жахлівых злачынстваў крывавыя нямецкія сабакі, і, разам з тым, адчуваючы свой прадсмяротны час, працягваюць учыняць злачынствы супроць беларускага народа.

Няма магчымасці пералічыць усе крывавыя злачынствы гітлераўцаў.

У стагоддзі ўвойдзе непрымірымая народная нянавісць супроць нямецкіх ізвергаў. Савецкі народ нічога не забудзе, нічога не даруе нямецка-фашысцкім зладзеям.

Час канчатковай расплаты за ўсе злачынствы, зробленыя немцамі на савецкай зямлі, набліжаецца. Ён немінучы, і ад справядлівай расплаты крывавыя нямецкія ізвергі не схаваюцца нідзе, ні на якім кутку зямлі. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

## III. Усенародны партызанскі рух у Беларусі

Ахоплены непрымірымай смяротнай нянавісцю да душыцеляў свабоды, разбуральнікаў беларускай дзяржавы, крывавых катаў—нямецкіх захватчыкаў, беларускі народ па закліку таварыша Сталіна ўзняўся магутнай сілай на абарону савецкай Радзімы, свабоды, чэсці, жыцця.

Беларускі народ паўсямесна разгарнуў бязлітасную партызанскую вайну з нямецкімі захватчыкамі і вядзе яе з першых дзён Айчыннай вайны з усё нарастаючай сілай. Партызанская вайна ахапіла велізарныя масы насельніцтва, вырасла ў грозную сілу і ператварылася ў адну з важнейшых умоў непазбежнага разгрому ворага.

Вайна ідзе супроць усіх ваенных, эканамічных, палітычных, гаспадарчых і ідэалагічных мерапрыемстваў акупантаў. Барацьба ідзе ўсюды: у гарадах, у вёсках, на чыгуначных камунікацыях, на прадпрыемствах.

Партызанскі рух у Беларусі прыняў паўсямесна ўсенародны характар. Няма такога кутка, раёна ці горада, дзе-б не адбывалася жорсткая партызанская вайна супроць захватчыкаў.

З 184,7 тысячы квадратовых кілометраў акупіраванай захватчыкамі тэрыторыі 108 тысяч квадратовых кілометраў, ці каля 60 процантаў, уключаючы тысячы насялёных пунктаў, утрымліваюцца і кантраліруюцца партызанамі.

За два з паловай годы беларускія партызаны знішчылі 368.371 салдат і афіцэраў— захватчыкаў, больш 80 тысяч паранена, 1.742 салдат і афіцэраў узялі ў палон. Знішчана 8.269 варожых эшалонаў, якія ішлі на фронт з жывой сілай, тэхнікай і снаражэннем для гітлераўскіх армій, а таксама тых, якія вывозілі нарабаванае на акупіраванай тэрыторыі дабро. Пры гэтым знішчана 5.912 паравозаў, 54.573 вагоны.

Беларускія партызаны за гэты час зрабілі некалькі дзесяткаў тысяч нападаў на вайсковыя штабы, гарнізоны, склады, вузлы і станцыі ворага, пры гэтым знішчана 284 самалёты, 1033 танкі, 14.500 аўтамашын і велізарная колькасць іншай ваеннай маёмасці. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Партызанамі захвачаны трафеі: сотні аўтамашын, матацыклаў, гармат, мінамётаў, 1.622 кулямёты, 27.830 вінтовак і аўтаматаў і вялікая колькасць рознай маёмасці.

Дзесяткі тысяч савецкіх ваеннапалонных вызвалены партызанамі з лагераў. Сотні тысяч мірных грамадзян выратаваны партызанамі ад знішчэння і ўгону на катаржныя работы ў Германію.

Гэтыя лічбы баявых дасягненняў партызанскіх атрадаў Беларусі складзены на падставе даных Беларускага штаба партызанскага руху па данясеннях і справаздачах камандавання партызанскіх атрадаў, брыгад і абласных падпольных цэнтраў кіраўніцтва партызанскім рухам.

Мы маем таксама справаздачныя даныя германскіх штабаў аб велізарных стратах захватчыкаў, якія пацвярджаюць прыведзеныя вышэй лічбы страт нямецкіх войск у баях з партызанамі.

У верасні 1943 г. адным з партызанскіх атрадаў быў захвачаны афіцэр нямецкага генштаба Вольфганг Фідлер—начальнік аддзела па барацьбе з партызанамі цэнтральнай армейскай групы. Пры ім быў захвачаны загад камандзіра корпуса войск аховы № 1721 ад 31 жніўня 1943 г., у якім гаворыцца пра абстаноўку і мерапрыемствы супроць партызан, а таксама даецца справаздача аб дзеяннях партызан, стратах і трафеях за жнівень 1943 г.

Згодна прыкладзенай карты, корпус войск аховы цэнтральнай армейскай групы займаў тэрыторыю, якая роўна адной чацвертай частцы Беларусі. У прыкладзенай да загада справаздачы аб сутычках з партызанамі ўказваецца, што за жнівень 1943 г. на тэрыторыі, занятай корпусам, адбылося:

агнявых баёў з партызанамі—663,
нападаў партызан на гарнізоны—898,
нападаў партызан на войскі--513,
усяго—2.074 баі з партызанамі.
Знішчана партызанамі бургамістраў—23,
зроблена выбухаў на чыгунках—14.590,
выбухаў на шасейных дарогах—194,
узарвана мастоў—125,
пашкоджана ліній сувязі—105.

Такое сведчанне ворага аб размаху і актыўнасці партызанскага руху ў Беларусі. Такія падлічаныя ворагам лічбы страт ад удараў беларускіх партызан.

Адну з важнейшых адзнак партызанскага руху Вялікай Айчыннай вайны ўяўляе тое, што партызанскі рух, які мае адзінае ваеннае кіраўніцтва і валодае сучаснымі сродкамі сувязі, мае магчымасць праводзіць сканцэнтраваныя адначасовыя ўдары па найбольш адчувальных аб'ектах праціўніка.

Найбольш значнай у гэтым сэнсе вялікай аперацыяй, праведзенай па адзінаму плану на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі, была так званая рэйкавая вайна. У мэтах аказання садзейнічання наступаючым войскам Чырвонай Арміі была распрацавана аперацыя па адначасоваму масаваму знішчэнню рэек на чыгунках праціўніка і дэзарганізацыі руху. Распрацаваная ў ліпені месяцы 1943 г. аперацыя была даведзена да партызанскіх атрадаў і злучэнняў, і ў першых лічбах жніўня партызанскія атрады, авалодаўшы перагонамі чыгунак, збіўшы ахову на ўсіх шляхах, узарвалі за дзве ночы 36 тысяч рэек. За першыя 12 дзён аперацыі было ўзарвана 94.477 рэек. Працягваючы гэту аперацыю, за жнівень месяц было ўзарвана 120.800 рэек, а ўсяго з жніўня да канца 1943 г. было ўзарвана 219.000 рэек.

Першы ўдар быў такі шырокі, паўсямесны і ашаламляючы, што вывеў са строю многія чыгуначныя лініі. На некаторых лініях захватчыкам прышлося перайсці з двухпутнага на аднапутны рух. Але пракладзеныя рэйкі зноў узрываліся партызанамі.

Па даных адпаведных ваенных інстанцый, у жніўні і верасні месяцах 1943 г. дзякуючы гэтай аперацыі партызаны сарвалі рух на чыгунках акупіраванай тэрыторыі больш чым на 40 процантаў.

Гэтай аперацыяй беларускія партызаны аказалі неацанімую дапамогу Чырвонай Арміі ў яе летнім, асеннім і зімовым наступленні.

Камандзір корпуса войск аховы цэнтральнай армейскай групы ў дакуменце 1721-41 ад 31 жніўня 1943 г. па гэтаму поваду пісаў у стаўку германскага вярхоўнага галоўнакамандавання наступнае:

„Партызанамі ўпершыню праведзена аперацыя небывалых размераў па зрыву нямецкага падвозу шляхам планамернага і раптоўнага парушэння чыгуначных зносін. 6.784 выбухі за першыя дзве ночы жніўня на ўчастку корпуса. Лік удалых узрываў рэек да сярэдзіны жніўня ўзрос да 15 тыс., а да канца месяца дасягнуў 20.101 у параўнанні з 470 выбухамі ў чэрвені і 771 выбухам у ліпені. Такім чынам, лік выбухаў за адзін месяц роўны ў некалькі разоў узросшаму ліку выбухаў за год. Толькі за адзін месяц лік выбухаў павялічыўся ў 30 разоў".

У часе разгрому аднаго з варожых эшалонаў сярод захвачаных партызанамі нямецкіх дакументаў аказалася падшыўка штодзённых справаздач упраўлення чыгунак акупіраванай тэрыторыі аб дзеяннях партызан. Гэтыя справаздачы з'яўляюцца самым яскравым сведчаннем размаху партызанскай вайны ў Беларусі і баявой актыўнасці беларускіх партызан.

(Працяг гл на 4 стар.)

# Працяг даклада П. К. Панамарэнка

Прывядзем справаздачы за 16, 19 верасня і 2 лістапада. Агульную характарыстыку становішча на чыгунках справаздача за 16 верасня выкладае наступным чынам:

„Становішча вельмі напружанае. Дзейнасць партызан, якая няспынна павялічваецца, ва ўсіх раёнах дасягнула к часу, указанаму ў данясенні, паграджаючых памераў. Захаваць рух з пераключэннем больш немагчыма. Лініі падвяргаюцца няспыннаму нападу. Вакзалы перапоўнены з-за немагчымасці выкарыстаць лініі. Паязды затрымліваюцца на чыгуначных лініях. Лік нягодных паравозаў усё павялічваецца. Калі не праводзіць усеахопліваючых мерапрыемстваў, якія-б прынеслі вынікі, пацерпіць крушэнне ўвесь ход справы на перагоне Мінск—Жлобін—Гомель, Брэст—Лунінец—Гомель, Жлобін—Магілёў і Орша—Крычаў—Унеча“.

Далей следуе апісанне здарэнняў з указаннем часу, месца, характару здарэнняў і панесеных страт. Справаздача за кожны дзень утрымлівае звыш 20 старонак. Справаздачы за ўказаныя дні даюць такі малюнак здарэнняў:

| | 16.IX | 19.IX | 2.XI |
|---|---|---|---|
| Цяжкія крушэнні паяздоў | 95 | 40 | 22 |
| Напады на паязды | 38 | 18 | 11 |
| Загараджэнне шляху | 171 | 44 | 96 |
| Узрывы рэйкавых шляхоў | 1103 | 1100 | 314 |

З прычыны гэтых дзеянняў партызан 19 верасня быў спынены рух на 16 чыгуначных лініях у агульнай складанасці на 217 гадзін ці ў сярэднім больш, чым на 13,5 гадзіны на кожнай лініі. 2 лістапада быў спынен рух на 10 чыгуначных лініях на 180 гадзін, г. зн. у сярэднім на 18 гадзін кожная лінія.

Такія вымушаныя прызнанні ворага аб сіле ўсенароднага партызанскага руху ў Беларусі.

Не цяжка бачыць, якую велізарную дапамогу аказваюць пабеданоснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі адважныя партызаны і партызанкі, якія з чэсцю выконваюць указанні Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна.

На гераічную барацьбу адважных партызан і партызанак заўсёды натхнялі адданасць і любоў да сваёй Радзімы, да большэвіцкай партыі і таварыша Сталіна.

Таварыш Сталін і совецкі ўрад аказвалі і аказваюць велізарную падтрымку беларускаму народу, партызанам і партызанкам.

Вобраз вялікага Сталіна натхняе беларускіх партызан і партызанак, беларускі народ у самаадданай барацьбе з нямецкімі захватчыкамі. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Большэвіцкія арганізацыі Беларусі з'яўляюцца душой—арганізатарамі і кіраўнікамі партызанскага руху.

Узброеную барацьбу мас супроць захватчыкаў узначальвае комуністычная партыя большэвікоў Беларусі. На чале гэтай барацьбы на месцах сталі людзі з народа, да канца адданыя партыі Леніна—Сталіна. Гэта—партыйныя, совецкія, гаспадарчыя, комсамольскія, прафсаюзныя, навуковыя работнікі. Гэта—брыгадзіры калгасаў, старшыні і члены сельсоветаў, шматлікая сельская інтэлігенцыя—аграномы, настаўнікі, землямеры, калгаснікі і рабочыя, партыйныя і беспартыйныя, якія ўзняліся да ўзроўню арганізатараў партызанскага руху.

У варожым тыле ўсюды дзейнічаюць падпольныя антыфашысцкія арганізацыі і камітэты, абласныя і раённыя камітэты КП(б)Б. Выдаюцца 2 рэспубліканскія, 8 абласных і 100 раённых газет, якія друкуюцца ў падпольных друкарнях, выдаюцца больш 30 часопісаў, сотні рукапісных газет і сотні тысяч лістовак. Яны карыстаюцца велізарнай папулярнасцю сярод насельніцтва, мабілізуюць народ на барацьбу з нямецкімі захватчыкамі, усяляюць веру ў хуткі і непазбежны разгром гітлераўскай Германіі, расказваюць праўду аб барацьбе совецкага народа за чэсць і незалежнасць сваёй Радзімы.

Трэба адзначыць таксама ўсё значэнне ў справе развіцця і кіраўніцтва партызанскай барацьбой жывых непасрэдных сувязей партызан з органамі кіраўніцтва. З тыла няспынна прыбываюць прадстаўнікі партызанскіх атрадаў, злучэнняў і падпольных цэнтраў за інструктажом, матэрыяламі, са справаздачамі, затым накіроўваюцца назад. Для інструктажу, па заданнях урада і Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі працяглы час у партызанскіх атрадах праводзяць сакратары цэнтральных камітэтаў КП(б)Б і ЛКСМБ, народныя камісары, загадчыкі аддзелаў ЦК і іншыя кіруючыя рэспубліканскія дзеячы.

Усенародны партызанскі рух у Беларусі вырасціў выдатных кіраўнікоў—арганізатараў партызанскай вайны, доблесных герояў—партызан і партызанак. 30 беларускіх партызан і партызанак маюць званне Герояў Совецкага Саюза. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ). 12 тысяч адважных партызан і партызанак узнагароджаны ўрадавымі ўзнагародамі, ордэнамі і медалямі Саюза ССР. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Беларускі народ ганарыцца такімі арганізатарамі, як выдатны партызанскі арганізатар, граза нямецкіх захватчыкаў, легендарны сын беларускага народа Герой Совецкага Саюза Канстанцін Сяргеевіч Заслонаў (АПЛАДЫСМЕНТЫ), як Героі Совецкага Саюза Міхаіл Сільніцкі, Ціхан Бумажкоў, Ісачанка, Паўлоўскі, Лабанок, Дуброўскі, Казлоў, Мачульскі, Цітмоў, Манковіч, Лівенцаў, Каралёў, Кляшчоў, Азончык, Барыкін, Захараў, Зябніцкі, Кожар, Котчанка, Лунін, Маркаў, Сікорскі, Цімчук, Ціхаміраў, Чарнышоў, Арлоўскі, Пруднікаў і тры беларускія жанчыны Героі Совецкага Саюза таварышы М., О. і Т. (БУРНЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

Тут на сесіі прысутнічаюць дэпутаты Вярхоўнага Совета, арганізатары партызанскага руху, якія прыбылі на сесію з тыла праціўніка: дэпутат Вярхоўнага Совета камандзір партызанскага злучэння Вілейшчыны палкоўнік Маркаў (АПЛАДЫСМЕНТЫ), дэпутат Вярхоўнага Совета—адзін з арганізатараў партызанскага руху Магілёўскай абласці палкоўнік Маўчанскі (АПЛАДЫСМЕНТЫ), дэпутат Вярхоўнага Совета—адзін з арганізатараў партызанскага руху на Палессі Ветраў (АПЛАДЫСМЕНТЫ), дэпутат Вярхоўнага Совета адважная партызанка Пальцава (АПЛАДЫСМЕНТЫ) і камандзіры партызанскіх злучэнняў Герой Совецкага Саюза генерал-маёр Казлоў (АПЛАДЫСМЕНТЫ), Герой Совецкага Саюза генерал-маёр Каралёў (АПЛАДЫСМЕНТЫ), кіраўнік аднаго з падпольных цэнтраў тав. Паромчык (АПЛАДЫСМЕНТЫ), камандзіры і камісары злучэнняў тт. Клявакін, Падалян, Мазур, Грыцан, Сухаў, Ляпёшкін. (БУРНЫЯ ПРАЦЯГЛЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

ТАВАРЫШЫ ДЭПУТАТЫ!

Задача адважных партызан і партызанак, камандзіраў і камісараў партызанскіх атрадаў і злучэнняў, падпольных партыйных раённых і абласных цэнтраў, усіх антыфашысцкіх арганізацый і ўсіх совецкіх патрыётаў акупіраванай часткі Беларусі—працягваць работу па далейшаму распальванню ўсенароднага партызанскага руху, па актывізацыі партызанскай барацьбы і дэзарганізацыі тыла праціўніка, па ўзмацненню дапамогі наступаючай Чырвонай Арміі, па выратаванню насельніцтва ад знішчэння і ўгону ў рабства, па захаванню насялёных пунктаў ад спальвання нямецкімі захватчыкамі.

Падпольным партыйным арганізацыям Беларусі неабходна яшчэ шырэй разгарнуць палітычную работу сярод насельніцтва, мабілізуючы яго на актыўны ўдзел у барацьбе супроць нямецкіх захватчыкаў.

Нямецкія захватчыкі, адступаючы пад ударамі Чырвонай Арміі з Беларусі, імкнуцца ўсюды правесці пагалоўнае знішчэнне насельніцтва. Яны знішчаюць усюды фабрыкі і заводы, спальваюць насялёныя пункты.

Задача партызанскага руху ў Беларусі ў цяперашні момант заключаецца ў тым, каб бяспрыкладнай у гісторыі па маштабах і актыўнасці партызанскай барацьбой сарваць зладзейскія замахі немцаў па знішчэнню насельніцтва і насялёных пунктаў.

У гэтым будзе заключацца гістарычная заслуга партызанскага руху Беларусі перад сваім народам.

Слаўныя партызаны і партызанкі, бясстрашныя народныя мсціўцы будуць узнімаць совецкіх людзей на ўзброеную барацьбу супроць немцаў, усямерна ўзмацняць дапамогу наступаючай Чырвонай Арміі, граміць тылы і штабы ворага, не даваць яму падвозіць рэзервы. Партызаны і партызанкі будуць выратоўваць совецкіх людзей ад знішчэння і ўгону іх на катаргу ў Германію, бязлітасна знішчаць нямецка-фашысцкіх нягоднікаў, помсціць ім за крывавыя злачынствы. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

## IV. Бліжэйшыя задачы аднаўлення прамысловасці, энергетыкі і жыллёва-комунальнай гаспадаркі ў вызваленых раёнах

1 студзеня гэтага года Соўнарком Саюза і ЦК ВКП(б) па прапанове таварыша Сталіна прынялі рашэнне «Аб бліжэйшых задачах Соўнаркома БССР і ЦК КП(б) Беларусі». Гэта рашэнне прадстаўляе сабою праграму аднаўлення народнай гаспадаркі ў вызваленых ад нямецкіх захватчыкаў раёнах Беларусі.

У галіне аднаўлення прамысловасці і жылля рашэнне ставіць перад намі наступныя галоўныя задачы:

а) аднаўленне прамысловасці і хутчэйшы пуск, перш за ўсё, прамысловых прадпрыемстваў, неабходных для абслугоўвання патрэб фронта, для аднаўлення народнай гаспадаркі, а таксама для забеспячэння патрэб насельніцтва;

б) усямернае развіццё вытворчасці тавараў шырокага спажывання на базе мясцовай сыравіны, развіваючы і выкарыстоўваючы для гэтай мэты мясцовую прамысловасць, саматужныя майстэрні і арцелі для задавальнення неадкладных патрэб насельніцтва, разбуранага і абрабаванага немцамі і не маючага неабходных рэчаў хатняга ўжытку;

в) аднаўленне і пабудова новых жыллёвых дамоў з мясцовых будматэрыялаў у вёсках, гарадах і рабочых пасёлках, вызваленых ад нямецкай акупацыі, з тым, каб забяспечыць размяшчэнне ў прыгодных для жылля памяшканнях калгаснікаў, рабочых і служачых, якія жывуць у цяперашні час у зямлянках і разбураных дамах.

У выкананне гэтых указанняў разгарнулася аднаўленчая праца ў рэспубліцы. Ужо зараз аднаўляюцца звыш 50 вялікіх і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў станкабудаўнічай, шкляной, цэментнай, тэкстыльнай, харчовай, лясной прамысловасці і некалькі электрастанцый.

Па лініі мясцовай прамысловасці арганізавана больш 150 прадпрыемстваў для вытворчасці прадметаў шырокага спажывання.

У г. Гомелі адноўлена 12.000 кв. метраў жыллёвай плошчы, аднаўляюцца дзесяткі шматкватэрных памяшканняў. У раёнах Магілёўскай вобласці адноўлена больш 1.500 дамоў калгаснікаў. У Лельчыцкім раёне, Палескай вобласці, ужо адбудавана каля 800 дамоў для калгаснікаў, і насельніцтва пачынае выбірацца з зямлянак.

На вызваленай тэрыторыі пачалася ўжо вытворчасць абутку, цэглы, запалак, мыла, мэблі, вапны, дзёгцю, калёс, будаўнічых дэталей, паленай пасуды.

Але ўсё гэта толькі пачатак. Галоўная праца—наперадзе.

Нашы задачы заключаюцца ў тым, каб у бягучым годзе адбудаваць жыллёвыя дамы для калгаснікаў, пазбаўленых прытулку з тым, каб нікога не пакінуць у зямлянках. Для гэтага трэба пабудаваць у сельскай мясцовасці да 100 тысяч дамоў. Каб перасяліць грамадзян, якія жывуць зараз у падвалах і поўразбураных дамах, трэба будзе аднавіць у Гомелі ў гэтым годзе звыш 100 тысяч кв. метраў жыллёвай плошчы і ў другіх гарадах не менш 50 тыс. кв. метраў.

Для таго, каб забяспечыць аднаўленне прамысловасці, жылля і соцыяльна-культурных установаў, неабходна ў найвышэйшых памерах разгарнуць вытворчасць мясцовых будаўнічых матэрыялаў. Гэту задачу павінны вырашаць усе народныя камісарыяты, усе прамысловыя прадпрыемствы, кожны раён, кожная вёска і кожны калгас.

Трэба ў шырокіх памерах паставіць лесапіленне і вытворчасць будаўнічых дэталей. Трэба шырока разгарнуць вытворчасць цэглы, чарапіцы, вапны і іншых будаўнічых матэрыялаў, прычым галоўны ўпор павінен быць зроблен на шырокае разгортванне чарапічных, цагельных і вапнавых заводаў мясцовага значэння ў раёнах, вёсках, калгасах. Толькі гэта будзе ў стане забяспечыць велізарную паўсямесную патрэбу ў будаўнічых матэрыялах.

(Працяг гл. на 5 стар.)

# Працяг даклада П. К. Панамарэнка

За гэту справу трэба ўзяцца, не трацячы ні хвіліны, ва ўсіх раёнах і настойліва, упорна, перамагаючы ўсе цяжкасці, стварацъ мясцовую прамысловасць будаўнічых матэрыялаў.

Неабходна забяспечыць водпуск у патрэбных памерах калгаснікам лесу з бліжэйшых да паселішчаў лесасек, прадаставіць калгаснікам крэдыт для аднаўлення будаўніцтва новых дамоў. Неабходна ўсямерна развіваць індывідуальнае і кааператыўнае будаўніцтва жыллёвых дамоў рабочых і служачых, аказваючы ім дапамогу крэдытам, мясцовымі будаўнічымі матэрыяламі і, па магчымасці, транспартам. Для гарадскога будаўніцтва, а таксама для аднаўлення заводаў неабходна ў кароткі тэрмін стварыць і ўмацаваць моцныя будаўнічыя арганізацыі, падрыхтаваць і навучыць дзесяткі тысяч будаўнічых рабочых, у асаблівасці прыцягваючы і навучаючы будаўнічым кваліфікацыям жанчын.

Як ні вялікі разбурэнні, але плённая і творчая праца, якая пачалася па аднаўленню народнай гаспадаркі, і велізарная дапамога, якую аказвае нам саюзны ўрад і брацкія рэспублікі, стварыць упэўненасць, што вялікая агульнанародная задача, пастаўленая таварышам Сталіным—«аднавіць разбураныя гарады і вёскі, прамысловасць, транспарт, сельскую гаспадарку, культурныя ўстановы, стварыць для совецкіх людзей, вызваленых ад фашысцкага рабства, нармальныя ўмовы жыцця... ліквідаваць вынікі гаспадарання немцаў у раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі»,—у Беларусі будзе намаганнямі ўсяго народа вырашана. (ПРАЦЯГЛЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

## V. Бліжэйшыя задачы аднаўлення сельскай гаспадаркі ў вызваленых ад нямецкіх захватчыкаў раёнах Беларусі

За час акупацыі нямецкія захватчыкі абрабавалі і знішчылі калгасную гаспадарку, машына-трактарныя станцыі, соўгасы, конезаводы, усе сельскагаспадарчыя навучальныя ўстановы і школы, разграбілі і знішчылі дабро калгаснікаў, рабочых і служачых, спалілі і знішчылі амаль усе грамадска-вытворчыя пабудовы калгасаў, соўгасаў і МТС, элеватары і млыны, разграбілі і знішчылі сельскагаспадарчыя машыны і інвентар, знішчылі сады.

Велізарныя страты нанесены нямецка-фашысцкімі захватчыкамі грамадскай жывёлагадоўлі калгасаў і жывёлагадоўлі калгаснікаў. У вызваленых раёнах засталося ўсяго ў адносінах да даваеннага ўзроўню коней 31 проц., буйнай рагатай жывёлы—26,7 проц., авечак—10 проц., свіней—7,6 проц.

У выніку гаспадарання фашысцкіх варвараў калгасы аказаліся разбуранымі, а калгаснікі абрабаванымі.

Ва ўмовах старой царскай Расіі з яе адсталым прамысловым развіццём і аднаасобнай дробнай сялянскай гаспадаркай такія разбурэнні ў сельскай гаспадарцы азначалі б дзесяцігоддзі жабрацтва і непамерных пакут мільёнаў людзей і соцень тысяч сялянскіх гаспадарак.

Не прыходзіцца закрываць вочы на велізарныя цяжкасці, якія мы адчуваем зараз пры аднаўленні так цяжка разбуранай немцамі сельскай гаспадаркі. Аднак, апіраючыся на магутнасць совецкай дзяржавы, на яе велізарную дапамогу калгаснаму сялянству, на плённую калектыўную працу калгаснікаў, на ўзаемную брацкую дапамогу калгаснікаў і калгасаў другіх абласцей і рэспублік, на нястомную напружаную творчую працу нашых совецкіх і партыйных арганізацый,—мы можам і павінны аднавіць сельскую гаспадарку вызваленых раёнаў і абласцей Беларусі за самы кароткі тэрмін.

Беларускае калгаснае сялянства, якое з велізарнай радасцю сустрэла Чырвоную Армію—вызваліцельніцу ад нямецкіх захватчыкаў, з велізарным энтузіязмам і рашучасцю з першых-жа дзён прыступіла да аднаўлення калгасаў і калгаснай гаспадаркі. Усюды, ва ўсіх калгасах вызваленых раёнаў ужо абраны праўленні калгасаў, старшыні калгасаў, рэвізійныя камісіі. Адноўлены міжкалгасныя межы земляў, аднаўляюцца акты на вечнае карыстанне калгасаў зямлёю і іншыя дакументы калгаснікаў. Збіраецца і рамантуецца сельскагаспадарчы інвентар, зводзіцца ў калгасныя канюшні і рыхтуецца да вясны застаўшаяся рабочая жывёла, збіраецца насенне, ідзе падрыхтоўка да веснавой сяўбы, складаюцца вытворчыя планы калгасаў.

Якія-ж бліжэйшыя задачы совецкіх і партыйных арганізацый і калгаснага сялянства ў галіне аднаўлення калгасаў і ўзняцця сельскай гаспадаркі?

1. Найбольш важнай і неадкладнай задачай нашых калгасаў з'яўляецца своечасовае правядзенне веснавой сяўбы. Для таго, каб правесці паспяхова сяўбу ў сучасных умовах, патрабуецца:

а) поўнасцю падрыхтаваць насенне для веснавой сяўбы. Прыклад у гэтым нам даюць калгаснікі раёнаў, якія засыпалі насенне або заканчваюць засыпку. Варта сказаць, што калгасы асобных раёнаў не знаходзяцца ў аднолькавых умовах. Некаторыя вызваленыя раёны абрабаваны немцамі дашчэнту. Тут павінна прыйсці на дапамогу міжкалгасная і міжраённая ўзаемная дапамога;

б) у бліжэйшы час ужо трэба пачаць ворыва, перш за ўсё ў паўднёвых раёнах Палескай і Гомельскай абласцей. Поспех ворыва, а значыць, веснавой сяўбы мы можам вырашыць толькі максімальным і інтэнсіўным выкарыстаннем застаўшайся рабочай жывёлы. У многіх калгасах рэспублікі неабходна прыцягнуць да палявых сельскагаспадарчых работ кароў. У многіх выпадках прыдзецца практыкаваць і ўскопку палёў ручным спосабам.

Коней неабходна зараз усюды падрыхтаваць да веснавой сяўбы, нарыхтаваць неабходныя кармы і прывесці поўнасцю ў працаздольнае становішча.

Неабходна таксама поўнасцю праверыць і адрамантаваць увесь сельскагаспадарчы інвентар—плугі, бораны, культыватары. Поўнасцю падрыхтаваць збрую;

в) аднаўляемыя МТС павінны поўнасцю быць гатовымі да вясны і выставіць на ворыва 100 процантаў сваіх трактароў. Павінна быць забяспечана праца іх у дзве змены. Трактары павінны быць поўнасцю забяспечаны гаручым і змазачнымі матэрыяламі і працаваць беспераббойна. Тэхнічная дапамога трактарнаму парку павінна быць арганізавана ў палявых умовах.

Задача, аднак, заключаецца не толькі ў тым, каб засеяць зямлю. Задача заключаецца ў тым, каб пасеяць так, каб атрымаць добры ўраджай.

Як вядома, да вайны з года ў год у Беларусі нясупынна павышалася ўраджайнасць.

Гэта тлумачылася самаадданай працай беларускіх калгаснікаў, якія з велізарнай працавітасцю апрацоўвалі сваю зямлю і ўмацоўвалі з года ў год калгасы.

Гэта тлумачылася велізарнай матэрыяльнай дапамогай совецкай дзяржавы калгаснаму земляробству.

Гэта тлумачылася таксама і тым, што совецкія, партыйныя арганізацыі і зямельныя органы Беларусі працавалі не пакладаючы рук над унядрэннем перадавой агратэхнікі ў калгаснае земляробства. У Беларусі былі ўведзены паўсюды правільныя севаабароты. Мільёны пудоў угнаенняў—гною, попелу, торфу, птушынага памёту, тарфянога кампосту, а таксама мінеральных угнаенняў калгаснікі своечасова вывозілі на палі. Велізарная праца вялася па палепшанню якасці насення. Ужо сталі рэдкімі выпадкі, калі калгасы сеялі насеннем без пратручвання, прарошчвання і праверкі насення на ўсхожасць. Пераважнай у рэспубліцы стала радковая сяўба. Своечасова і ў адпаведнай правільным севаабаротам колькасці падніманіся папары, а таксама паднімалася зябліва.

Гэтыя асноўныя і непарушныя агратэхнічныя патрабаванні, якія з'яўляюцца залогам павышэння ўраджаю ў Беларусі, разумее кожны калгаснік.

І, калі мы хочам па-сапраўднаму пачаць аднаўляць сельскую гаспадарку, разбураную нямецкімі захватчыкамі, і сур'ёзна павесці калгасы па шляху росквіту, мы павінны ў першую ўжо вясну на вызваленай тэрыторыі правесці веснавую сяўбу, не гледзячы на ўсе цяжкасці, з захаваннем усіх асноўных правілаў агратэхнікі.

2. У калгасах неабходна пачаць шырокую работу па аднаўленню калгаснай жывёлагадоўлі, ферм буйнай рагатай жывёлы, конегадоўчых, аўцагадоўчых, свінагадоўчых і птушкагадоўчых ферм. Гэта важнейшае пытанне ў справе адраджэння калгаснай гаспадаркі і паспяховага яе ўздыму. Ужо цяпер павінна быць шырока разгорнута работа па адбудове і аднаўленню канюшань, кароўнікаў, свінарнікаў. Калгаснікі павінны весці вялікую падрыхтоўку па забеспячэнню калгаснай жывёлагадоўлі кармамі за лік пасеву траў, адводу сенакосаў, сенакашэння, сіласавання і г. д.

Ужо цяпер праўленнямі калгасаў павінны быць распрацаваны планы аднаўлення грамадскай жывёлагадоўлі калгасаў, разгледжаны і зацверджаны калгаснымі сходамі.

Крыніцай аднаўлення пагалоўя калгасных фермаў буйнай рагатай жывёлы ў сучасны момант павінны з'явіцца: кантрактацыя і пакупка цялят у калгаснікаў, рабочых і служачых, зварот захаваўшайся эвакуіраванай жывёлы з усходніх раёнаў краіны, завоз жывёлы ў парадку дапамогі калгасаў брацкіх рэспублік і затым вырошчванне пагалоўя на калгасных фермах.

3. Асобна я хацеў-бы спыніцца на важнасці ўсямернага развіцця справы грамадскай птушкагадоўлі ў калгасах, у асаблівасці развіцця ферм вадаплаваючай птушкі.

Наяўнасць велізарнай колькасці азёр, рэк, прудоў стварае самыя спрыяльныя ўмовы для шырокага развядзення вадаплаваючай птушкі ў рэспубліцы.

Калі дадаць да гэтага параўнаўчую няцяжкасць вырашэння пытання з кармамі для птушкі, а таксама тое, што калгасніцы любяць і заўсёды разводзілі птушку, мы маем усе ўмовы для таго, каб, апіраючыся на гэта, шырока развіць і грамадскую птушкагадоўлю вадаплаваючай птушкі ў кожным калгасе.

Трэба дабіцца, каб ужо ў гэтым годзе не менш, чым у палове калгасаў вызваленых абласцей былі створаны фермы вадаплаваючай птушкі, а на будучы год, каб кожны калгас абзавёўся гэтымі фермамі. Гэта з'явіцца велізарнай крыніцай уздыму добрабыту калгасаў і калгаснікаў і створыць дадатковыя ўмовы для развіцця жывёлагадоўлі.

4. Наяўнасць вялікай колькасці рэк, азёр і калгасных вадаёмаў у Беларусі стварае сур'ёзныя магчымасці для павелічэння харчовых рэсурсаў рэспублікі шляхам развіцця рыбалоўства ў натуральных вадаёмах і рыбалоўства ў калгасных прудах.

Азеры рыбапрамысловага значэння ў рэспубліцы займаюць 128 тысяч гектараў і рыбапрамысловыя рэкі—2.907 кілометраў. Апрача таго ёсць вялікая колькасць дробных азёр мясцовага значэння, якія магчыма выкарыстаць для калгаснага рыбаводства.

Да вайны рэспубліка мела плошчу прудоў у 12 тысяч гектараў, у якіх разводзілася рыба. Пруды гэтыя ў 1941 годзе павінны былі даць 80 тысяч пудоў рыбы.

У радзе калгасаў нашай рэспублікі да вайны рыбаводства і рыбалоўства было сур'ёзнай крыніцай павелічэння прыбыткаў калгасаў. Так, напрыклад, у калгасе „Чыстыя воды“, Жыткавіцкага раёна, з калгасных прудоў вымалі штогод 190 пудоў рыбы, а калгасы, размешчаныя навокал Асвейскага возера, штогод вылаўлівалі з возера больш 1.000 пудоў рыбы.

Аднак, варта сказаць, што, не гледзячы на выключна спрыяльныя ўмовы для развядзення рыбы і рыбалоўства, яно ў нас было развіта ў зусім недастатковай і неадпаведнай магчымасцям ступені.

Наша задача ў сучасны момант заключаецца, каб пытанне рыбаводства ў калгасных прудах і рыбалоўства ў натуральных вадаёмах вырашыць у дзяржаўным маштабе. Рыбалоўства ўжо ў гэтым годзе павінна даць вялікую колькасць каштоўнай харчовай прадукцыі, што дазволіць значна палепшыць харчовае забеспячэнне насельніцтва і з'явіцца дадатковай крыніцай прыбытку калгасаў і калгаснікаў.

Задача заключаецца ў тым, каб усюды ў калгасах рэспублікі, умела выкарыстоўваючы мясцовыя ўмовы, пабудаваць нагульныя пруды і правесці з вясны іх зарыбленне.

Рыбалоўства і рыбаводства ў Беларусі павінны стаць сур'ёзнай крыніцай прыбыткаў калгасаў і прывесці да значнага палепшання харчовага забеспячэння насельніцтва.

5. Варта спыніцца яшчэ на адным важным пытанні—на развіцці садоўніцтва ў нашай рэспубліцы.

Да пачатку вайны ў Беларусі было 82.000 гектараў калгасных садоў і 200 тысяч садоў калгаснікаў, рабочых і служачых. Валавы збор пладоў з калгасных садоў дасягнуў у сярэднім 250 тысяч тон у год. Гэта дало магчымасць ва многіх калгасах павялічыць грашовую аплату працадня за лік садаводства на 4—5 рублёў. Створаныя за апошняе дзесяцігоддзе шматлікія і выдатныя пітомнікі служылі асновай далейшага шырокага развіцця садоўніцтва ў рэспубліцы.

(Працяг гл. на 6 стар.)

# Працяг даклада П. К. Панамарэнка

Большасць калгасных садоў нямецка-фашысцкімі захватчыкамі высечаны, выламаны, выкапаны і вывезены ў Германію.

Мы павінны ўжо ў гэтым годзе прыступіць у шырокіх памерах да аднаўлення садаводства ў рэспубліцы. Трэба паставіць сабе задачу, каб у бліжэйшыя годы кожны калгас, кожны калгасны двор, кожны двор рабочага, служачага, двор кожнай школы, сельсовета, больніцы, сядзібы МТС і г. д. меў-бы сад.

Для гэтага трэба прыступіць неадкладна да аднаўлення пітомнікаў пладовых дрэў і плодаягадных кустарнікаў. Неабходна паставіць справу такім чынам, каб былі адноўлены не толькі дзяржаўныя пітомнікі, але былі-б невялікія пітомнікі пры школах, калгасах, МТС.

Трэба ў справу развіцця садоўніцтва шырока ўцягнуць нашых школьнікаў, культывіраваць у іх любоў да вырошчвання дрэў, зрабіць іх вялікай сілай у справе аднаўлення садоўніцтва.

Сады дадуць нашаму народу сотні тысяч тон фруктаў, павідла, джэму, варэння і г. д. Сады ўпрыгожаць нашу Савецкую Беларусь.

6. Адным з сур'ёзнейшых пытанняў у справе аднаўлення соцыялістычнай сельскай гаспадаркі з'яўляецца пытанне аб правільным, удумлівым кіраўніцтве калгасамі, вылучэнні і абучэнні калгасных кадраў. Таварыш Сталін у 1933 г. у прамове аб рабоце ў вёсцы гаварыў:

«Калгасы, як соцыялістычная форма арганізацыі гаспадаркі, могуць паказаць цуды гаспадарчага будаўніцтва, калі на чале іх стаяць сапраўдныя большэвікі, калі яны забяспечаны людзьмі, здольнымі планіраваць гаспадарку і весці яе арганізавана".

Да вайны з кожным годам усё больш і больш квітнелі калгасы ў нашай рэспубліцы. Многія калгасы сталі калгасамі-мільянерамі. Гэта ў ліку іншага тлумачылася тым, што кіраўнікі калгасаў, старшыні калгасаў, былі сапраўднымі гаспадарамі сваёй справы. Яны, апіраючыся на дапамогу дзяржавы, апіраючыся на працоўную актыўнасць калгаснікаў, шырока і правільна выкарыстоўвалі ўсе магчымасці, закладзеныя ў калгаснай гаспадарцы. Яны своечасова і правільна вялі гаспадарку і атрымлівалі высокі ўраджай, яны множылі калгаснае пагалоўе і мелі сур'ёзны прыбытак ад жывёлагадоўлі. Яны развівалі калгасныя сады і рабілі гэта таксама сур'ёзнай крыніцай прыбытку калгасаў, яны мелі пасекі, рыбныя пруды, птушкафермы. Яны правільна і добра арганізавалі працу калгаснікаў.

Гэтыя калгасы мелі перспектыўныя, разлічаныя на некалькі год наперад, планы развіцця калгаса і росту яго багаццяў і забяспечвалі яго выкананне. Гэтыя калгасы не былі на асобным становішчы. У іх не было ніякіх пераваг ва ўмовах развіцця гаспадаркі ў параўнанні з другімі калгасамі. Яны ва ўсім былі надзелены аднолькавымі рэсурсамі.

Стала быць, справа ў тым, што на чале гэтых калгасаў стаялі кіраўнікі-большэвікі, адданыя калгаснаму ладу і здольныя на справе забяспечыць росквіт калгаснай гаспадаркі.

Пагэтаму важнейшай задачай дзяржаўных і партыйных органаў у сучасны момант з'яўляецца падбор і вылучэнне старшынь калгасаў, здольных па-сапраўднаму весці калгасную гаспадарку, дапамагчы калгасным кадрам. Старшынь калгасаў трэба вучыць правільнай арганізацыі справы, вучыць паўсядзённа і прадметна, унікаючы ў калгасную вытворчасць, дапамагаючы калгасам правільна і поўнасцю выкарыстаць магчымасць калгаснай гаспадаркі. Трэба дапамагчы старшыням скласці правільны перспектыўны план развіцця калгаса і згуртаваць калгаснікаў на яго паспяховае выкананне.

7. Зараз асабліва неабходна ўсяму нашаму народу вызваленых раёнаў, усім совецкім і партыйным арганізацыям узмацніць палітычную пільнасць.

Нямецкія захватчыкі разумелі, што калгасны лад складае сілу нашай дзяржавы і з'яўляецца крыніцай дабрабыту нашага народа. Таму яны ўсе свае сілы прыкладалі да таго, каб дыскрэдытаваць гэты лад, падарваць і разбурыць яго. Яны, выкарыстоўваючы нечуваную хлусню, правакацыі і прымус, прабавалі засмеціць свядомасць некаторай часткі маласвядомых калгаснікаў, развязаць прыватна-ўласніцкія інстынкты, каб павярнуць іх на шлях індывідуальнай гаспадаркі, зручны нямецкім захватчыкам для рабскай эксплаатацыі і прыстасавання эканомікі Беларусі да патрэб прыгонніцкай гаспадаркі фашысцкай Германіі.

Аднак усе іх спробы праваліліся. Беларускі народ адданы калгаснаму ладу. Нашы калгаснікі з велізарным энтузіязмам узяліся аднаўляць калгасы. Але не варта закрываць вочы на тое, што немцы знайшлі некаторых агентаў з захаваўшыхся рэшткаў разбітага кулацтва і былых памешчыцкіх элементаў. Гэтыя агенты ворага могуць дзе-ні-дзе прымазацца да калгаса і весці сваю падрыўную работу. Няма сумнення ў тым, што нашы калгаснікі выкрыюць і прысякуць гэтых агідных паследышаў нямецкіх захватчыкаў. (ПРАЦЯГЛЫЯ АПЛАДЫСМЕНТЫ).

## VI. Дапамога Совецкага Ўрада і працоўных брацкіх рэспублік у справе аднаўлення народнай гаспадаркі вызваленых раёнаў Беларускай ССР

Таварышы дэпутаты!

Вы бачыце, якія велізарныя задачы аднаўлення прамысловасці, калгаснага земляробства, жыллёвага фонда стаяць перад намі. Патрабуецца велізарная праца ўсяго нашага народа, усяго нашага дзяржаўнага і партыйнага апарата, каб выканаць гэтыя задачы. У гэтай рабоце мы апіраемся на велізарнейшую па сваіх размерах дапамогу, якую нам аказваюць саюзны ўрад, брацкія рэспублікі і вялікі друг беларускага народа—таварыш Сталін.

Ніколі яшчэ не было ў гісторыі, каб якая-небудзь дзяржава, выдаткоўваючы велізарнейшыя сродкі на вядзенне вайны, у той-жа час у ходзе самой вайны мела-б магчымасць вызначаць вялікія сродкі матэрыяламі і машынамі на аднаўленне разбуранай ворагам гаспадаркі.

Толькі нашай дзяржаве пад сілу, побач з вядзеннем небывалай у гісторыі па маштабах і жорсткасці вайны, адначасова вырашаць такую гіганцкую задачу, як аднаўленне разбуранай немцамі гаспадаркі ў вызваленых раёнах.

У гэтым ёсць праяўленне сілы нашага совецкага народа, веліч і магутнасць нашай Радзімы.

Совецкі ўрад, ЦК ВКП(б) і асабіста таварыш Сталін аказваюць паўсядзённую і велізарную дапамогу ў справе аднаўлення прамысловасці, сельскай гаспадаркі, жыллёвых будынкаў і культурных установаў нашай рэспублікі.

Для адраджэння народнай гаспадаркі ў вызваленых раёнах Беларусі ўрадам асігнавана ў бюджэт Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі 429 мільёнаў рублёў. Вялікае значэнне гэтай дапамогі бачна з таго, што для вызваленых раёнаў, якія пакуль яшчэ не маюць дастатковых крыніц прыбытку па зацверджанаму бюджэту, вызначаецца 329 мільёнаў рублёў датацыі за лік саюзных сродкаў.

На аднаўленне асноўных галін прамысловасці ўрад Саюза вылучыў станкі, аўтамашыны, метал, лес, турбіны і генератары.

Для сельскай гаспадаркі ўжо завезена больш 1.500 трактараў.

Дзяржава закуплівае у калгасах і ў калгаснікаў усходніх абласцей СССР і перадае беларускім калгаснікам 13 тысяч коней, 80 тысяч галоў буйнай рагатай жывёлы, 130 тысяч авечак і коз, 50 тысяч галоў свіней, 150 тысяч галоў дарослай птушкі і 350 тысяч яек для інкубатараў.

На выдаткі, звязаныя са зваротам эвакуіраванай жывёлы, асігнавана ўрадам 1 мільён рублёў. Для будаўніцтва жывёлагадоўчых пабудоў і ветэрынарных установаў вызначана 350 тысяч кубаметраў лесу, 30 тон цвікоў, 50 тон сартавога жалеза, 10 тысяч квадратных метраў шкла.

Для аднаўляемых 90 МТС і 7 МТМ капітальнага рамонту дзяржава адпускае 70 металарэжучых станкоў, 160 грузавых аўтамашын, 7 тысяч жалезных бочак і на 2,5 мільёна рублёў запасных частак.

Да вясны завозіцца плугоў конных—2.000 штук, сартыровак—200, сенакасілак—100, акучнікаў—250, жняярак—150, жалеза сартавога—86 тон, мінеральных угнаенняў—1000 тон, мяхоў—24 000 штук і многа іншага сельскагаспадарчага інвентара.

Дзяржава аказвае велізарнейшую дапамогу вызваленым ад нямецкага гнёту калгаснікам, аднаасобнікам і калгасам. Вызвалена ад усіх відаў паставак больш 10 тысяч гаспадарак калгаснікаў і аднаасобнікаў, якія пацярпелі ад нямецкіх захватчыкаў. Адпушчана ў 1943 годзе бясплатна калгаснікам і аднаасобнікам 300 тысяч кубаметраў лесу на адбудову дамоў, а таксама доўгатэрміновыя крэдыты на адбудову да 10 тысяч рублёў кожнай гаспадарцы. У вызваленыя раёны завозіцца для продажу насельніцтву соль, мыла, газа, баваўняныя тканіны, гатовае пальто, абутак, цукар і іншыя прамысловыя тавары шырокага спажывання.

Велізарную дапамогу аднаўленчым работам аказваюць нам брацкія рэспублікі і абласці Совецкай Расіі. Удмурцкая АССР, Новасібірская, Ульянаўская, Яраслаўская абласці разгарнулі сур'ёзную работу па збору матэрыяльных рэсурсаў у дапамогу вызваленым раёнам Беларускай ССР. Ужо ідуць эшалоны з Новасібірска, Іжэўска, Яраслаўля і Ульянаўска са станкамі, трактарамі, абсталяваннем для кузняў, сталярных, швейных і іншых майстэрняў, абсталяваннем і інвентаром для больніц, школ, дзіцячых дамоў і г.д.

Апіраючыся на вялікую дапамогу Совецкага ўрада, брацкіх саюзных рэспублік, беларускі народ сваёй самаадданай працай адновіць разбураную немцамі народную гаспадарку, адродзіць соцыялістычную прамысловасць і соцыялістычную сельскую гаспадарку. (АПЛАДЫСМЕНТЫ).

## VII. Клопаты аб сем'ях ваеннаслужачых і партызан, інвалідах Айчыннай вайны і дзецях-сіротах

Партыя Леніна—Сталіна, Совецкі ўрад праявілі выключныя клопаты аб сем'ях чырвонаармейцаў, камандзіраў Чырвонай Арміі і партызан, клопаты аб інвалідах Айчыннай вайны, клопаты аб дзецях, якія засталіся сіротамі, і дзецях франтавікоў і партызан.

Зараз у вызваленыя раёны Беларускай ССР прыбываюць ужо са шпіталяў інваліды Айчыннай вайны. Ёсць многа дзяцей-сірот мірнага насельніцтва, знішчанага захватчыкамі. Ёсць дзеці партызан, якія ў сучасны момант вядуць барацьбу ў тыле нямецкіх войск. Клопаты аб сем'ях франтавікоў і партызан, аб дзецях абаронцаў нашай Радзімы, аб інвалідах Айчыннай вайны—справа вялікай дзяржаўнай важнасці.

Задача дзяржаўных органаў совецкай улады, партыйных, профсаюзных і комсамольскіх арганізацый, кіраўнікоў устаноў і прадпрыемстваў, старшынь і праўленняў калгасаў заключаецца ў тым, каб акружыць іх увагай, клопатамі, дапамагчы ім у бытавым упарадкаванні, у паступленні на працу, у навучанні іх розным пасільным ім прафесіям, аказаць дапамогу ім у набыцці адзення, абутку, пратэзаў, у рамонце жылля, у апрацоўцы гародаў, забеспячэнні іх палівам, стварыць вакол іх атмасферу ўдзелу, увагі, цёплых таварыскіх адносін.

Совецкая дзяржава адпускае на гэтыя мэты велізарныя сродкі і матэрыяльныя фонды. Неабходна, каб яны былі правільна і па-гаспадарску выкарыстаны.

Сярод кіруючых работнікаў дзяржаўных, партыйных і другіх апаратаў не можа быць безуважных людзей да гэтай важнейшай дзяржаўнай справы.

Асабліва трэба падкрэсліць неабходнасць праяўлення вялікіх і сур'ёзных клопатаў аб совецкіх людзях, вырваных наступаючымі войскамі Чырвонай Арміі з лап фашысцкіх катаў, якія выратаваліся ад смерці і ўгону ў нямецкае рабства.

Задачай дзяржаўных і партыйных органаў прыфрантавых раёнаў з'яўляецца аказанне неадкладнай дапамогі і праяўленне клопатаў аб іх. Неадкладнае іх размяшчэнне, выкарыстоўваючы для гэтай мэты памяшканні, якія толькі магчыма адразу-ж прыстасаваць, пропуск праз лазні, санпрапускнікі, неадкладная арганізацыя харчавання, аказанне медыцынскай дапамогі хворым. Затым размяшчэнне здаровых па калгасах, працоўнае ўпарадкаванне і аказанне дапамогі транспартам для тых, якія вяртаюцца да сталага месцажыхарства.

ТАВАРЫШЫ ДЭПУТАТЫ!

У вялікай Айчыннай вайне беларускі народ з новай сілай паказаў сваё непарушнае адзінства, згуртаванасць, сваю бязмежную адданасць сваёй соцыялістычнай Радзіме—вялікаму Совецкаму Саюзу. Ні дзікія зверствы нямецкіх захватчыкаў, ні іх крывавыя рэпрэсіі, ніякія выкруты ворага не змаглі зламаць волі народа да барацьбы, не маглі раскалоць адзінства беларускага народа. Усе цяжкасці і выпрабаванні вайны перанёс народ, і ён застаўся непахісны, не збіваючыся

(Працяг гл. на 7 стар.)

